Падтрымай "Вясну" на PATREON

Суды за падтрымку Эдуарда Пальчыса: 130 базавых дапоўнена

17.11.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Супрацоўнік міліцыі складае пратаколы на ўдзельнікаў акцыі ў падтрымку Э. Пальчыса.

Сёння ў Мінску праходзяць суды над удзельнікамі акцый салідарнасці з блогерам Эдуардам Пальчысам, крымінальная справа якога разглядалася ў Мінскім гарадскім судзе з 14 па 25 кастрычніка. У судзе Маскоўскага раёна разглядаюцца адміністрацыйныя справы **Алеся Макаева** і **Віктара Кулака**, у судзе Першамайскага раёна – актывіста “Еўрапейскай Беларусі” **Леаніда Кулакова**.

Суддзя **Святлана Чараповіч** прызначыла Леаніду Кулакову пакаранне ў выглядзе штрафу ў памеры 50 базавых велічынь. Актывіст настойваў на арышце, паколькі не мае сродкаў на аплату штрафу.


Алеся Макаева пакаралі штрафам у памеры 50 базавых велічынь, а Віктару Кулаку суддзя **Віктар Казак** вынес пастанову аб пакаранні штрафам у памеры 30 базавых.


У розныя дні пад час працэсу каля суда праводзілі акцыі салідарнасці з Эдуардам Пальчысам дзесяткі грамадскіх дзеячоў, палітыкаў, актывістаў. Сярод іх - Павал Севярынец, Зміцер Дашкевіч, Алесь Макаеў, Наталля Басалыга, Леанід Кулакоў, Вольга Нікалайчык, Дзяніс Садоўскі, Максім Вінярскі, Максім Кулак, Яўген Афнагель, Арцём Бабоўнікаў, Яўген Бычкоўскі, Павел Пракаповіч, Уладзімер Яроменак, Вольга Маёрава, Антось Жылка, Сяргей Пальчэўскі, Мікалай Дземідзенка, Юля Фралова ды іншыя.

На ўсіх іх супрацоўнікі міліцыі склалі пратаколы правапарушэння па арт. 23.34 КаАП (удзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве).

Твитнуть








"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Дзень палітвязняў Беларусі. Да якіх мерапрыемстваў можна далучыцца?







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"


Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"


"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY